Дзяржаўная ўстанова дадатковай адукацыі
«Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі Салігорскага раёну»

# Выраб цацкі-свістулькі "Конік" па традыцыйнай тэхналогіі

занятак па дэкаратыўна-прыкладному мастацтву



Пратасеня Мікалай Аляксеевіч
педагог дададковай адукацыі,
кіраўнік Заслужанага аматарскага калектыву РБ студыі "Скарбонка"

Салігорск 2023

**Мэта:** фарміраванне ўменняў і навыкаў работы ў тэхніцы традыцыйнай беларускай керамікі, актывізацыя пазнавальнай дзейнасці і творчай актыўнасці навучэнцаў з дапамогай уключэння іх у практычную дзейнасць па вырабу цацкі-свістулькі “Конік”.

**Задачы:**

*Адукацыйныя:*

- пазнаёміць з гісторыяй развіцця і характэрнымі асаблівасцямі беларускай народнай керамікі, з творчасцю вядомых майстроў;
- пашырыць веды аб цацках-свістульках на Беларусі;
- навучыць тэхналогіі вырабу глінянай цацкі-свістулькі;
- удасканальваць уменні і навыкі лепкі з гліны;
- паўтарыць асновы стылізацыі зааморфных вырабаў;
- сфарміраваць уменні творча прымяняць народныя тэхналогіі ў сучасных умовах;
- вызначыць асаблівасці Салігорскай глінянай свістулькі.

*Развіваючыя:*

- развіваць творчую актыўнасць і здольнасці навучэнцаў шляхам стварэння цацкі-свістулькі;
- актывізаваць зрокавую памяць, вобразнае ўяўленне, мастацкую фантазію;
- фарміраваць зацікаўленасць да стварэння цацкі, маючай нацыянальную адметнасць, гісторыка-культурную значнасць і мастацкую каштоўнасць.

*Выхаваўчыя:*

- выхоўваць эмацыянальную спагадлівасць, жаданне займацца творчасцю;
- стымуляваць захаванне каштоўнасных адносін да народнага мастацтва, нацыянальных традыцый, імкнення да іх творчага засваення і захавання;
- садзейнічаць фарміраванню калектывізму і ўзаемадапамогі;
- ствараць умовы для выхавання патрыятычных адносін да сваёй Радзімы;
- выхоўваць акуратнасць, цярпенне, працавітасць.

**Тып занятку:** камбінаваны.

**Метады навучання:** славесны, наглядны, практычны.

**Метадычны матэрыял:** план занятку, інструкцыйныя карты,

**Матэрыялы і інструменты:** гліна, шлікер, качалка, дошчачка, лінейка, стэк-праколка (універсальны), дапаможная палачка з дрэва цыліндрычнай формы дыяметрам 7-10 мм і даўжынёй 7-12 см з акругленым канцом.

## Ход занятку

**Падрыхтоўчы этап**

Арганізацыйны момант.

Добры дзень, хлопчыкі ідзяўчынкі. Я – педагог дзяржаўнай установы дадатковай адукацыі «Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі Салігорскага раёну», кіраўнік Заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь студыі “Скарбонка” Пратасеня Мікалай Аляксеевіч.

Мэтавая ўстаноўка.

***1.Знаёмства з тэмай і мэтай майстар-класа.***

Тэма нашага занятку “Выраб цацкі-свістулькі “Конік” па традыцыйнай тэхналогіі”. Сёння вы даведаецеся аб гісторыі ўзнікнення беларускай цацкі, яе разнавіднасцях, асаблівасцях вырабу свістулек, і навучыцеся ствараць цацку-свістульку “Конік”.

**Тэхналагічны этап**

Арганізацыя пазнавальнай дзейнасці.

***1. Гісторыя глнянай цацкі.***

Першыя цацкі, знойдзеныя пры раскопках, былі вельмі падобнымі да прылад працы, прадметаў побыту, іх выраблялі з простых прыродных матэрыялаў з мэтай авалодвання дзецьмі навыкамі будучай дзейнасці. У археалагічных вынаходках на тэрыторыі Беларусі цацкі трапляюцца, пачынаючы з неаліту – апошняга перыяду каменнага веку, г.зн. з часу пашырэння ў першабытных плямёнаў керамікі. Ганчарным промыслам амаль заўсёды спадарожнічаў выраб гліняных цацак. Сярод іх бразготкі – пустацелыя гліняныя шарыкі, яйкі з каменьчыкамі ўнутры, фігурныя цацкі-свістулькі (Дадатак 1).

Праз цацку малому ў гульнёвай форме перадаваўся як працоўны, так і духоўны вопыт народа – праз вобразы цацак дарослыя як бы падрыхтоўвалі дзяцей да самастойнага жыцця. Набор цацак у сялянскіх дзяцей у XIX і нават ў сярэдзіне XX стагоддзя быў вельмі сціплы. Пакупная цацка рэдка трапляла ў дзіцячы быт. Цацкі былі самаробныя, зробленыя бацькамі ці старэйшымі дзецьмі. Падрастаючы, дзеці рабілі сабе цацкі самі.

У Беларусі да самых распаўсюджаных народных цацак адносяцца цацкі, зробленыя з гліны. Гліняныя цацкі ствараюцца прасцейшымі прыёмамі лепкі і вызначаюцца ўмоўнасцю форм і вобразаў. Выявы гэтых фігур статычныя, з акруглымі ножкамі і стромкімі шыямі. Абагуленасць формы, выразнасць сілуэта, мінімальная пластычная трактоўка вобраза без непатрэбных дэталяў, манументальная цэльнасць канструкцыі без лішкаў каляровага аздаблення і, у той жа час, цеплыня і непасрэднасць у падачы вобраза – такая яна, народная цацка.

***2. Маляўнічыя вобразы цацак-свістулек.***

*Навучэнец у беларускім народным касцюме:*

А заплакала дзіцятка,
У свістульку свішча татка.
Вось дык забаўка, здаўна
З гліны робіцца яна.

*(Навучэнец свісціць у свістульку-коніка).*

Цацкі-свістулькі ў даўнія часы выкарыстоўвалі як рытуальныя фігуркі, звязаныя з абрадамі каляндарных сельскагаспадарчых святаў, якія суправаджаюцца свістам, адсюль і свістулькі. Вядомая з старажытнасці і абярэжная функцыя свістулек. Па славянскіх паняццях, свіст адганяе «нячыстую сілу», злых духаў. Цацкі з гліны ствараліся без імкнення перадаць анатамічныя асаблівасці, досыць было адной-дзвюх дэталяў, каб атрымаць каня, які адрозніваецца ад каровы. Любімымі ў народзе былі вобразы каня, аленя, мядзведзя, птушкі, вершніка, барана, казла.

Птушкі – вестуны вясны, лета і багіні Маці-Зямлі. Казёл спрыяў ураджаю, уяўляў сабой добрую сілу. Карова і баран былі сімваламі ўрадлівасці і магутнасці. Алень – сімвал багацця і ўдалага шлюбу. У аснове ўсіх народных гліняных цацак ляжаць тры вобразы: конь, птушка і баба. З іх з нязначнымі зменамі ствараліся іншыя. З птушкі нараджаюцца ўсе свісцячыя цацкі. Конь можа ператварыцца ў карову, казу або барана. Баба становіцца асновай многафігурных кампазіцый, або трактуецца па-рознаму ў месцах пражывання цацачных промыслаў.

Колер, як і форма ў народнай цаццы, мае сімвалічнае значэнне. Чырвоны – агонь, сонца, колер зямлі. Жоўты – колер хлебнай нівы і зноў сонца. Зялёны – раслінны арнамент, сімвал адраджэння жыцця.

***3. Асаблівасці вырабу свістулек.***

Свістулька – гэта своеасаблівы полы керамічны выраб. У ім ёсць свістковае прыстасаванне і могуць быць гукавыя адтуліны (мал. 1). Гук (свіст) у свістульцы атрымліваецца за кошт выкарыстання фізічных уласцівасцей паветра. Струмень паветра, які мы, выдыхаючы, накіроўваем у свістульку, пападае ў паветраны канал, потым – у паветраную камеру, пасля – на язычок свістковай адтуліны і падзяляецца язычком на два патокі. Адзін з іх праходзіць на глыбіню рэзанатарнай камеры нашай цацкі, а другі мае знешні напрамак. Ваганне гэтых патокаў стварае гук (свіст). Калі зрабіць у рэзанатарнай камеры 1-2 адтуліны, то, адкрываючы і закрываючы іх, мы будзем змяняць ціск паветра ў сярэдзіне камеры і хуткасць вагання паветраных патокаў (вышыню гуку).

**Практычная частка.**

***1. Прадстаўленне матэрыялаў для работы.***

Для работы нам спатрэбяцца наступныя інструменты і матэрыялы: дошчачка, губкі, гліна, стэк-праколка (універсальны), дапаможная палачка з дрэва цыліндрычнай формы дыяметрам 7-10 мм і даўжынёй 7-12 см з акругленым канцом. У дапамогу вам – тэхналагічная карта паслядоўнасці вырабу цацкі-свістулькі (Дадатак 2).

***2. Паслядоўнасць выканання цацкі-свістулькі “Конік”.***

1. Цацка выконваецца з аднаго кавалка гліны памерам з запалкавы карабок. Кавалку гліны надаем форму кароткага цыліндрыка, можна яйка, у сярэдзіну якога ўстаўляем дапаможную палачку акругленым канцом трошкі далей за сярэдзіну нашай нарыхтоўкі. Гэтая палачка будзе ўтвараць паветраную камеру і дасць нам магчымасць смела ствараць (ляпіць) форму нашай цацкі, не баючыся расплюшчыць яе ўнутраную частку.
2. З загатоўкі расплюшчваем і адцягваем частку гліны на шыю і галаву нашага коніка, а з процілеглага боку (уздоўж палачкі) – на хвост-свісток. З ніжняй часткі загатоўкі адцягваем, адшчыпваем чатыры аднолькавыя атожылкі-ножкі.
3. Адцягваем больш шыю, робім яе дугой, намячаем галоўку. Ножкі лепім невялікімі выступамі акругленай формы. Хвост адцягваем на 2,5-3 см, робім яго цыліндрычнай формы.

***Фізкультхвілінка***

Устаньце, дзеткі, усміхніцеся,
Зямлі нашай пакланіцеся.
За шчаслівы дзень учарашні.
Усе да сонца пацягніцеся,
Улева, управа нахіліцеся,
Верацёнцам пакруціцеся.
Раз прысядзьце, два прысядзьце
І за парты ціха сядзьце.

4. Верхнюю частку шыі трохі расплюшчваем, адцягваем вушкі ў верхняй частцы галавы, робім іх невялікімі акруглымі выступамі. Фарміруем пластычную форму галавы коніка. На шыі праціскаем стэкам рысы, якія імітуюць грыву. На галаве перад вушамі робім невялікія выемкі, у якіх робім стэкам вочы нашага коніка. На пярэдняй частцы галавы праціскаем стэкам рысу, якая імітуе рот нашай выявы. Пасля больш канкрэтна прапрацоўваем усю форму вырабу і дэталі.
5. Дапаможнаю палачкаю, якая знаходзіцца ў сярэдзіне вырабу, пашыраем унутраную ёмістасць. Калі яна стане свабоднай, выцягваем палачку. Адтуліну з краю залепліваем глінай на 5-7 мм. У ніжняй частцы хваста на адлегласці 5-7 мм стэкам прарэзваем прамавугольную свістковую адтуліну на шырыню стэка. Лішак гліны можна дастаць стэкам або прыціснуць да задняй сценкі ўнутры свістка. Стэкам і пальцам расплюшчваем процілеглы край адтуліны, робім язычок вострым.
6. Плоскай часткай стэка паралельна язычку, крыху яго прыціснуўшы, у напрамку да задняй сценкі робім шчыліну  на шырыню стэка. Глядзім, каб шчыліна – гэта паветраны канал – не забілася глінаю, калі будзем вымаць стэк. Трэба, каб струмень паветра, які будзе выходзіць з канала, пападаў на язычок, тады цацка будзе гучаць. Тон, вышыня гуку будзе залежыць ад велічыні рэзанатарнай ёмістасці. Калі яна маленькая, гук будзе больш моцны і высокі. Пры большай поласці, ён будзе ніжэйшым, глухаватым. У паветранай камеры, тулаве нашай свістулькі, можна зрабіць 1-2 адтуліны вострым канцом стэка. Закрываючы і адкрываючы іх пальцамі, можна мяняць вышыню гука.

**Заключны этап**

***1. Цацкі старажытнасці – для сучаснага пакалення***

Цацка-свістулька – гэта твор чалавечага інтэлекту, генетычная памяць культурных зносін грамадства, выраб, які ўвасобіў у сабе дзіцячую забаўку. Цацка-свістулька – адзін з першых флейтавых інструментаў, які стаў творам мастацтва.

Цяпер ствараецца шмат цацак-свістулек. Якой толькі формы, дызайну, дэкаратыўнага аздаблення яны не маюць! Але наша традыцыйная свістулька па-ранейшаму прыцягвае ўвагу сваёй прастатой, лаканічнасцю і непаўторным хараством (Дадатак 3).

***2. Падвядзенне вынікаў.***

Сёння мы з вамі здзейснілі падарожжа ў мінулае, пазнаёміліся з тэхнікай выканання складанай традыцыйнай беларускай цацкі-свістулькі і стварылі такую цацку, якую рабілі людзі шмат стагоддзяў назад. Гэта пасланне старажытнага чалавека, што дайшло да нас праз многія рукі пакаленняў, якія збераглі яго, не дазволілі яму знікнуць.

**Рэфлексія. Конікі нашага настрою**

А зараз мы з вамі даведаемся, з якім настроем вы сёння пакінеце наш ўтульны кабінет. Перад вамі ў скарбонке – рознакаляровыя конікі на падстаўках. Калі занятак вам вельмі спадабаўся – вы ставіце на дошчачку коніка чырвонага колеру, калі ў вас радасны сонечны настрой – ставіце коніка жоўтага колеру, калі вы поўныя жадання падзяліцца добрым настроем са сваімі сябрамі – ставіце коніка зялёнага колеру. Калі ваш настрой спалучае ўсе гэтыя ўласцівасці, можаце паставіць некалькі конікаў.

Дзякуй за работу!

*Дадатак 1*

## Старажытныя гліняныя цацкі












*Дадатак 2*

**Тэхналагічная карта**

**“Выраб цацкі-свістулькі “Конік” па традыцыйнай тэхналогіі”**

| Тэхналогия выканання | Прыклад |
|---|---|
| Кавалку гліны надаем форму кароткага цыліндрыка, можна яйка, у сярэдзіну якога ўстаўляем дапаможную палачку акругленым канцом трошкі далей за сярэдзіну нашай нарыхтоўкі. |  |
| З загатоўкі расплюшчваем і адцягваем частку гліны на шыю і галаву нашага коніка, а з процілеглага боку  (уздоўж палачкі) – на хвост-свісток. З ніжняй часткі загатоўкі адцягваем, адшчыпваем чатыры аднолькавыя ножкі. |  |
| Адцягваем больш шыю, робім яе дугой, памячаем галоўку. Ножкі лепім невялікімі выступамі акругленай формы. Хвост адцягваем на 2,5-3 см, робім яго цыліндрычнай формы. |  |

| | |
|---|---|
| Верхнюю частку шыі расплюшчваем, адцягваем вушкі ў верхняй частцы галавы, робім іх невялікімі акруглымі выступамі. На шыі  праціскаем стэкам рысы, якія імітуюць грыву. На галаве перад вушамі робім невялікія выемкі, у якіх робім стэкам вочы нашага коніка. На пярэдняй частцы галавы праціскаем стэкам рысу, якая імітуе рот нашай выявы. |  |
| Дапаможнаю палачкаю, якая знаходзіцца ў сярэдзіне вырабу, пашыраем унутраную ёмістасць. Адтуліну з краю залепліваем глінай на 5-7 мм. Стэкам і пальцам расплюшчваем процілеглы край адтуліны, робім язычок вострым |  |
| Пасля ў ніжняй частцы хваста на адлегласці 5-7 мм стэкам прарэзваем прамавугольную свістковую адтуліну на шырыню стэка. |  |
| Плоскай часткай стэка паралельна язычку, крыху яго прыцісноўўшы, у напрамку да задняй сценкі робім шчыліну на шырыню стэка. Глядзім, каб шчыліна не забілася глінаю, калі будзем вымаць стэк. Трэба, каб струмень паветра, які будзе выходзіць з канала, пападаў на язычок, тады цацка будзе гучаць. |  |

*Дадатак 3*

**Цацкі-свістулькі ў творчасці навучэнцаў Заслужанага аматарскага калектыву студыі “Скарбонка”**

